# Калектыўная форма навучання як педагагічная тэхналогія

Бронз Ганна Юр’еўна

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Сёння адукацыйны працэс разглядаецца як педагогіка супрацоўніцтва, пры гэтым існуе праблема вучэбнага супрацоўніцтва, гэта значыць, калектыўных, групавых формаў навучання. Вучэбнае супрацоўніцтва ўяуляе сабой сістэму ўзаемадзеяння настаўнік – вучань (вучні), вучань – вучань, групавое ўзаемадзеянне вучняў у калектыве. Практыка навучання пры ўкараненні калектыўных формаў работы ў вучэбны працэс паказвае, што менавіта арганізацыйная схема “вучань – вучань” (вучэбнае супрацоўніцтва) мае значныя рэзервы для фарміравання пазнавальнай матывацыі, садзейнічае павышэнню эфектыўнасці навучання, самаацэнкі і развіццю асобы вучня.

Тэарэтычныя даследванні і практычны вопыт паказваюць, што веды аказваюцца больш трывалымі, калі прадмет вучэбнай дзейнасці выступае як сродак зносін. У такім становішчы ў працэсе навучання ўзнікаюць зносіны вучня паміж сабою па прычыне прадмета, гэта значыць па схеме суб’ект (вучань) – аб’ект (прадмет) – суб’ект (вучань). Пры гэтым у ходзе навучання веды павінны быць атрыманы вучнямі больш ці менш самастойна. Правільныя суадносіны дзейнасці і зносін дазваляюць арганічна злучаць навучальную і выхаваўчую функцыі вучэбнага працэсу.

Групу вучняў перш за ўсё трэба разглядаць як калектыў, які займаецца сумеснай вучэбнай дзейнасцю, а працэсы зносін у групе падчас заняткаў – як працэсы, якія фарміруюць міжасобныя адносіны ў гэтым творчым калектыве. Пры групавым інтэнсіўным навучанні ўзнікае вучэбны калектыў, які станоўча ўплывае на станаўленне асобы кожнага. У гэтым выпадку зносіны становяцца неабходным атрыбутам вучэбнай дзейнасці, а прадметам зносін з’яўляюцца яе прадукты: вучні непасрэдна ў працэсе заснавання ведаў абменьваюцца вынікамі пазнавальнай дзейнасці, абмяркоўваюць іх. Часта індывідуальная работа па схеме “настаўнік – вучань” пазбаўляе навучальны працэс найважнейшага звяна – міжасобасных зносін і міжасобаснага ўзаемадзеяння праз навучанне. Міжасобасны кантэкст нараджае ў групе асабістую аўру, якую А. С. Макаранка называў атмасферай “адказнай залежнасці”. Без яе немагчыма актывізацыя асобасных якасцяў і плённая выхаваўчая работа настаўніка.

Міжасобасныя зносіны ў вучэбным працэсе павышаюць матывацыю шляхам уключэння сацыяльных стымулаў: з’яўляецца асабістая адказнасць,

пачуццё задавальнення ад публічнага перажываемага поспеху ў навучэнні. Усё гэта фарміруе ў школьнікаў якасна новыя адносіны да прадмета, пачуццё асабістай прыналежнасці да агульнай працы, якая становіцца сумесным авалоданнем ведаў.

Пры арганізацыі калектыўнай работы вучняў узнікае шэраг цяжкасцяў арганізацыйнага, педагагічнага і сацыяльнага плана. Каб групавая работа па набыцці новых ведаў была па-сапраўднаму прадуктыўнай, неабходна прапанаваць вучням сумесную дзейнасць – цікавую, асабіста і сацыяльна значымую, грамадска-карысную, якая дазваляе размяркоўваць функцыі па індывідуальных магчымасцях.

Сутнасць калектыўных спосабаў навучання (КСН) як педагагічнай тэхналогіі заключаецца ў тым, што: 1) навучанне ажыццяўляецца шляхам супрацоўніцтва ў "дынамічных парах" (са зменным саставам), калі кожны вучыць кожнага; 2) развіваюцца камунікатыўныя навыкі зносін і гаварэння (навуковымі даследаваннямі пацверджана: чым больш чалавек гаворыць, тым больш ён развіваецца).

У тэхналогіі КСН выкарыстоўваецца ідэя ўзаемнага навучання без уліку адрозненняў наяўнага ўзроўню ведаў і здольнасцяў, уключаючы ў дыялог-зносіны ўсіх дзяцей за кошт выкарыстання формы дынамічных (зменных) пар, у якіх удзельнік выступае па чарзе то вучнем, то настаўнікам.

Граматычныя заданні, падрыхтаваныя па колеравых картках, накіраваны на самастойнае засваенне вучнямі тэарэтычнага матэрыялу па адпаведнай тэме і адначасова на выпрацоўку практычных уменняў і навыкаў. Заданні носяць рознаўзроўнены характар. Названая тэхналогія дапамагае бачыць адразу вынік засваення моўнага матэрыялу амаль усім класам. У залежнасці ад якасці засваення тэмы, узроўню складанасці выканай працы на ўроку, дамашняе заданне вызначаецца пэўным узроўнем складанасці. У працэсе самастойнага пошуку, які вядуць вучні, фарміруецца іх актыўная пазнавальная дзейнасць, развіваецца ўменне наладжваць камунікатыўныя зносіны з партнёрам, абуджаецца імкненне да самарэалізацыі і адэкватнай самаацэнкі і ўзаемаацэнкі, выхоўваецца пачуццё задавальнення ад самастойна набытых ведаў і ўсведамлення дапамогі, аказанай партнёру.

Аўтар тэорыі калектыўнага спосабу навучаннч В. К. Дзячэнка ўзяў за аснову смелыя ідэі навучання ў парах зменнага саставу, прапанаваныя і правераныя на практыцы ў 20–30-ыя гады XX ст. педагогам А. Г. Рывіным, развіў і ўдасканаліў іх. В. К. Дзячэнка падышоў да навучання як да педагагічных зносін. Навучанне – гэта зносіны паміж тымі, хто мае вопыт і веды, і тымі, хто іх набывае. Значыць, навучанне, як і зносіны, можа ажыццяўляцца непасрэдна і апасродкавана. Апасродкаваныя зносіны

ажыццяўляюцца праз пэўныя заданні, якія выконвае вучань. Адсюль і вынікае індывідуальная форма арганізацыі працэсу навучання. Непасрэдныя зносіны ажыццяўляюцца праз вусную мову. Гэта зносіны двух чалавек у пары і зносіны групы, якія могуць адбывацца ў двух варыянтах: 1) адзін гаворыць, а ўсе астатнія слухаюць (настаўнік тлумачыць класу, вучань адказвае перад класам); 2) зносіны членаў групы па чарзе адзін з адным у дынамічных парах зменнага саставу (яны атрымалі ў А. Г. Рывіна назву "дыялагічныя спалучэнні"). Такія зносіны людзей найбольш характэрныя для чалавека і распаўсюджаныя ў жыцці або ў парах. Адпаведна гэтым відам зносін мы маем яшчэ тры формы арганізацыі працэсу навучання: парную, групавую (будуецца па прынцыпе: аднаго гаворчага адначасова слухаюць усе астатнія члены групы) і ў парах зменнага саставу (ПЗС). Апошнюю арганізацыйную форму навучання В. К. Дзячэнка і называе калектыўнай (КФН). Пры гэтым, як паказалі назіранні Т. Ліопы і Т. Прадзед [1, 37], адбываецца глыбокае ўсведамленне навучальнага матэрыялу, фарміраванне агульнага прынцыпу выканання пазнавальных заданняў, развіваюцца навыкі пераносу агульных прыёмаў з засвоенага раздзела ведаў у вывучаемы. Усё гэта ў канчатковым выніку садзейнічае развіццю школьнікаў. Акрамя таго, вучні выпрацоўваюць камунікатыўныя ўменні, набываюць навыкі самакіравання і самаарганізацыію працэс навучання, калі кожнаму даверана вучыць іншага, робіцца цікавым. Развіваюцца ініцыятыва, творчыя адносіны да выканання заданняў, жаданне даць як мага больш ведаў партнёру. Калектыўнае супрацоўніцтва на ўроку здымае напружанасць, страх, пачуццё прыгнечанасці і дае магчымасць індывідуальнага і свабоднага развіцця кожнага вучня.

Такім чынам, калектыўныя формы навучання маюць важнае значэнне для фарміравання пазнавальнай матывацыі, садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці навучання, самаацэнкі і развіццю асобы вучня.

## Літаратура

1. Ліопа, Т. Прыступка да поспеху: Калектыўныя формы навучальнага ўзаемадзеяння на ўроках беларускай мовы пры дыферэнцыраваным навучанні / Т. Ліопа, Т. Прадзед // Роднае слова. – 1994. – С. 36–40.